УДК 320.02

***Коршак М.А., Стралец М.В.***

# СВЯТЛАНА ВАЛЯНЦІНАЎНА МАРОЗАВА: ПАРТРЭТ НАВУКОЎЦЫ І ПЕДАГОГА



**Уводзіны.** У айчыннай гістарыяграфіі адчуваецца відавочны недахоп прац, у якіх даследуецца навукова-педагагічная дзейнасць буйных вучоных-жанчын. Аўтары дадзенага артыкула вырашылі зрабіць свой унёсак у ліквідацыю гэтага недахопу на прыкладзе аднаго з лідэраў гродзенскай гістарычнай школы Святланы Валянцінаўны Марозавай.

У любым энцыклапедычным даведніку можна прачытаць наступнае: "Марозава Святлана Валянцінаўна – беларускі гісторык, даследчык гісторыі уніяцкай царквы Беларусі ў XVI–XIX ст., доктар гістарычных навук (з 2002 г.), прафесар (з 2007 г.), загадчык кафедры гісторыі Беларусі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы (з 2009 г.)". За гэтай кароткай інфармацыяй стаіць яскравая асоба, вартая таго, каб ёй прысвячаць даклады, артыкулы.

Жыццёвы шлях навукоўцы і педагога распачаўся 56 год таму. Нарадзілася 22 лістапада 1954 г. у сяле Ілля (цяпер у Вілейскім раёне Мінскай вобласці). Паходзіць з сям'і педагогаў-філолагаў. Бацька Марозаў Валянцін Іванавіч – кандыдат філалагічных навук, даследчык асаблівасцяў мовы твораў Францішка Багушэвіча – быў беларускамоўным і прышчапіў дачцы любоў да роднай мовы. Сям'я таксама выхавала такія якасці, як працавітасць, сціпласць, шчырасць.

Пачала навучанне ў Ратамскай школе Мінскай вобласці. Працягнула вучобу ў Гродна. У школьныя гады займалася мастацкай гімнастыкай і фатаграфаваннем, у старэйшых класах наведвала факультатыў па беларускай мове. Закончыла з залатым медалём сярэднюю школу № 18 г. Гродна. З удзячнасцю ўспамінае сваіх настаўнікаў, а асабліва філолага Таісію Паўлаўну Целеш і гісторыка Анну Уладзіміраўну Доста, методыка выкладання якой вызначыла выбар Святланай прафесіі гісторыка. У сваім выбары яна не памылілася: гісторыя спалучылася ў яе асобе і як прафесія, і як хобі.

У 1972–1977 г. Святлана вучылася на гісторыка-педагагічным факультэце Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Янкі Купалы і закончыла яго з дыпломам з адзнакай. Пад уплывам навуковага кіраўніка доктара гістарычных навук, прафесара Якава Навумавіча Мараша далучылася да студэнцкай навукі і зацікавілася гісторыяй рэлігіі і царквы Беларусі ў XVI–XIX ст. Удзельнічала ва ўсесаюзным конкурсе студэнцкіх навуковых работ, на якім атрымала другую катэгорыю.

На першым курсе асвоіла спецыяльнасць экскурсавода і чатыры гады працавала пазаштатным экскурсаводам Гродзенскага турыстычнага бюро. У асноўным гэта былі выязныя экскурсіі. Каб не ўпусціць інстытуцкія веды, працавала ў асноўным па выхадных і на канікулах. Асабліва запатрабаваныя экскурсаводы летам: вечарам яна вяртаецца, напрыклад з Вільнюса, а назаўтра яе шлях ляжыць у Львоў. Шмат падарожнічала тады ў якасці кіраўніка турыстычных груп 18–20-гадовая дзяўчына, якая часам была самая маладая з усіх турыстаў. Экскурсанты яе любілі, як і работнікі турбюро, якія не абдзялялі маладога экскурсавода і разнастайнасцю турыстычных маршрутаў, і яе любімымі маршрутамі. Геаграфія яе паездак: ад Рыгі і Таліна да Ужгарада і Львова з поўначы на поўдзень і ад Гродна і Брэста да Масквы з захаду на ўсход. Тады Святлана пабачыла свет, навучылася жыццёвай мабільнасці, камунікабельнасці, зведала радасць зносін з людзьмі з усяго Савецкага Саюза.

Потым была педагагічная дзейнасць ў школах Барысаўскага раёна Мінскай вобласці, Бытчанскай і Бродаўскай, дзе ў 1977–1979 г. працавала спачатку піянерважатай, а потым настаўнікам гісторыі і арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай работы.

У час працы ў школе давала знаць інстытуцкая даследчая загартоўка, атрыманая ад вядомага вучонага Я.Н.Мараша. Святлана адчувала, што здольная на большае, чым выкладаць гісторыю па чужых кнігах. Таму шукала шляхі ў аспірантуру, але для пачатку стала спашукальніцай.

У 1979–1982 г. займалася ў аспірантуры пры кафедры гісторыі БССР Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. На пытанне свайго "навуковага бацькі" прафесара Я.Н.Мараша, якую хоча распрацоўваць праблему, ваганняў не было: "Не ведаю якую, але – абавязкова па гісторыі рэлігіі". Так Святлана стала даследчыцай Берасцейскай царкоўнай уніі (спачатку – на храналагічным адрэзку 1596–1667 г.), вывучэнню якой прысвяціла і ўсё сваё наступнае навуковае жыццё. З таго часу вядуць яе навуковыя шляхі раз-пораз у Санкт-Пецярбург, дзе захоўваецца знакаміты Архіў уніяцкіх мітрапалітаў. Крыніцазнаўчую, палеаграфічную падрыхтоўку, якую не даў педагагічны інстытут (гэта універсітэт рыхтуе педагогаў і даследчыкаў), прыйшлося асвойваць самой. Беларускі скорапіс і лацінка, старапольская, а часам і лацінская мова, абвятшалыя і паблёклыя старажытныя рукапісы, часта неякасна мікрафільмаваныя, усе архівы – па-за межамі Беларусі, немасавы характар крыніц па гісторыі уніі і іншыя "выгоды" даследавання XVI – XVII стагоддзяў – нішто не спужала аспірантку, якая не шукала лёгкіх шляхоў у навуцы. Ужо пазней, праз шмат гадоў, калі Святлана Валянцінаўна "зазірнула" і ў апошні перыяд гісторыі царкоўнай уніі, прыйшло разуменне, у якім выйгрышным становішчы знаходзяцца даследчыкі айчыннай гісторыі XIX і асабліва XX стагоддзяў: лепшая захаванасць дакументаў, якія, як правіла, лёгка чытабельныя, пісаныя на рускай мове, да таго ж у дастатковай колькасці маюцца ў наяўнасці ў Беларусі. Але сваёй ВКЛ-аўскай гісторыі даследчыца не здрадзіла: з часам прыйшло добрае разуменне даследуемай эпохі, у якую Святлана грунтоўна "ўжылася".

У 1983 г. у Вучоным савеце Беларускага дзяржаўнага універсітэта

***Коршак Михаил Антонович**, кандидат исторических наук, доцент Брестского государственного университета им. А.С. Пушкина.*
*Беларусь, БрГУ им. А.С. Пушкина, 224016, г. Брест, б-р. Космонавтов, 21.*

імя У.І.Леніна Святлана Валянцінаўна абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму "Брэсцкая царкоўная унія 1596 г. і барацьба народных мас Беларусі супраць нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту (1596–1667 г.)". Зразумела, свой час, панаваўшая ідэалогія, гістарыяграфічная традыцыя дыскрэдытацыі уніі, урэшце, аўтарытэт навуковага кіраўніка наклалі адбітак на трактоўку маладой даследчыцай праблемы, хоць ужо тады зараджаліся сумненні ў правільнасці пануючага погляду на унію. Тым не менш, факт моцнага антыуніяцкага руху напярэдадні і пасля 1596 г. і сёння застаецца неабвержным. Бачанне ж сутнасці гэтай барацьбы ў даследчыцы змянілася.

З 1982 г. Святлана Валянцінаўна працуе ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы, спачатку – асістэнтам, з 1984 г. – дацэнтам (вучонае званне дацэнта атрымала ў 1989 г.), з 2002 г. – прафесарам. 28 гадоў ужо налічвае яе стаж навуковай, навукова-педагагічнай працы. 26 з іх яна аддала сваёй Alma Mater, якую палюбіла яшчэ са студэнцкіх часоў і працай у якой ганарыцца. Універсітэт стварыў усе ўмовы для дасканалення Марозавай-педагога і росту кваліфікацыі Марозавай-даследчыцы. У сваіх навуковых і адукацыйных праектах яна заўсёды атрымлівала разуменне і падтрымку універсітэцкага кіраўніцтва.

Акрамя канфесійнай гісторыі Беларусі (гісторыя уніяцкай царквы) XVI–XIX ст., якая стала сферай трывалай і моцнай навуковай цікавасці С.В.Марозавай, яна далучылася да краязнаўчых даследаванняў, а з пачатку 90-х г., з штуршка, зададзенага прафесарам Іванам Іванавічам Коўкелем, – і да ўдзелу ў падрыхтоўцы вучэбнай літаратуры па айчыннай гісторыі Беларусі для школ і вышэйшых навучальных устаноў. Стала сааўтарам 18 вучэбных дапаможнікаў, у тым ліку аднаго электроннага выдання і чатырох – з грыфам Міністэрства адукацыі. Прадметам гонару Святланы Валянцінаўны з'яўляецца запрашэнне яе ў свае аўтарскія калектывы дацэнтамі Паўлам Алегавічам Лойкай і Уладзімірам Аркадзевічам Соснай, прафесарам Леанідам Вікенцьевічам Лойкай. Па вучэбнаму дапаможніку У.А. Сосны, С.В. Марозавай і С.В. Панова "Гісторыя Беларусі (XIX ст. – 1917 г.)" (пад рэд. М.С. Сташкевіча. Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2005. 167 с.) вось ужо 5 гадоў вывучаюць айчынную гісторыю ў школах нашай краіны. На аснове экспертызы гэтага дапаможніка, якую на працягу 2008/2009 навучальнага года праводзіў Нацыянальны інстытут адукацыі, ён быў рэкамендаваны да перавыдання ў 2010 г. Сярод студэнтаў да гэтага часу карыстаецца папулярнасцю курс лекцый у двух частках "Гісторыя Беларусі", у першай частцы якога С.В.Марозава з'яўляецца асноўным аўтарам (Гісторыя Беларусі: У 2 ч. / І.П. Крэнь, І.І. Коўкель, С.В. Марозава, С.Я. Сяльверстава, І.А. Фёдараў. – Мінск: РІВШ БДУ, 2000. – Ч.1: Са старажытных часоў да канца XVIII ст.: курс лекцый – 656 с.).

Новыя тэндэнцыі ў гістарычнай навуцы на постсавецкім абшары вабяць, клічуць Святлану Валянцінаўну, якая прагне сказаць у ёй і сваё важкае слова. Але адчувае, што напрацаванага навуковага багажу мала – патрэбны новыя крыніцы, новыя метадалагічныя падыходы, новыя ідэі, авалоданне найноўшай замежнай гістарыяграфіяй. З пачатку 90-х г., нарадзіўшы і падгадаваўшы другога сына, яна зноў актыўна ўваходзіць у другі этап сваёй навуковай дзейнасці. Вядзе актыўныя пошукі дакументаў і матэрыялаў у буйнейшых бібліятэках і архівах Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы і Польшчы. Узняцца да ўзроўню ведаў еўрапейскай навукі па уніяцкай праблематыцы дапамаглі навуковыя стажыроўкі, якія прайшла даследчыца ў 90-я – пачатку 2000-х г. у Варшаўскім, Ягелонскім і Вільнюскім універсітэтах, у Нацыянальнай бібліятэцы Польшчы.

Інстытут гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, у якім даследчыца уніі праходзіла падрыхтоўку ў дактарантуры ў 1993–1996 г., прыняў яе дабразычліва і з цікавасцю да яе навуковай праблематыкі, на распрацоўцы якой у савецкія часы ляжала негалоснае табу. Атмасфера галоснасці і дэмакратыі ў грамадстве, дыскусійнасць і альтэрнатыўнасць у навуцы, перадавая грамадская і навуковая пазіцыя, занятая Інстытутам гісторыі, урэшце, вольнае паветра сталіцы натхнялі на даследчую працу, далі магчымасць адыйсці ад панаваўшых наконт уніі 1596 г. стэрэатыпаў. А ўсплёск цікавасці да гісторыі Берасцейскай царкоўнай уніі ў беларускай і еўрапейскай навуцы, звязаны, акрамя іншага, з 400-годдзем гэтай спробы стварыць на беларускай глебе альтэрнатыву ўсходняму і заходняму хрысціянству, зрабілі даследаванні С.В.Марозавай запатрабаванымі, хоць і неадназначна ўспрымаемымі ў навуковых і царкоўных колах. Імя С.В. Марозавай, асабліва пасля выхаду ў свет яе манаграфіі "Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады)" (пад навуковай рэдакцыяй У.М. Конана. Гродна: ГрДУ, 2001. 352 с.) стала пазнавальным у беларускай і замежнай гістарычнай навуцы.

Добры ўспамін пра дактаранцкія часы ў Інстытуце гісторыі, якім тады кіраваў акадэмік М.П.Касцюк, і добрыя сувязі з галоўным "штабам" беларускай гістарычнай навукі засталіся назаўсёды, як і падтрымка з яго боку, якая для Святланы Валянцінаўны вельмі важная і ёй цанімая.

У 2002 г. яна абараніла там доктарскую дысертацыю. Да яе падрыхтоўкі, абмеркавання, крытыкі, апаніравання, абароны, як і да падрыхтоўкі вышэйзгаданай манаграфіі спрычыніліся буйныя беларускія вучоныя дактары філасофскіх навук У.М. Конан і С.А. Падокшын, дактары гістарычных навук А.П. Грыцкевіч, І.В. Аржахоўскі, М.С. Сташкевіч, кандыдаты гістарычных навук П.А. Лойка, В.Ф. Голубеў. Святлана Валянцінаўна лічыць за гонар, што гэтыя масцітыя вучоныя прайшлі праз яе навуковае жыццё.

Абарона дысертацыі доўжылася 5 гадзін, разгарнулася сапраўдная навуковая дыскусія, у якой сутыкнуліся розныя погляды на ролю уніяцкай царквы ў лёсе беларускага народа. Запалу дадалі пісьмовыя водзывы вядомых вучоных з па-за межаў Беларусі: Алега Латышонка з Польшчы, Міколы Нікалаева з Санкт-Пецярбурга, Васіля Ульяноўскага з Кіева.

Кажуць, што кандыдацкая дысертацыя – гэта ўваход у навуку, доктарская – выхад з яе. Гэта не пра Святлану Валянцінаўну. Праўда, годдва пасля прызнання яе ВАКам у доктарскай ступені была ў разгубленасці – здавалася страчанай стратэгічная мэта ў жыцці.

Але навуковая і грамадская актуалізацыя гісторыі Вялікага княства Літоўскага, пераўтварэнне канфесійнай гісторыі Усходняй Еўропы ў адзін з прыярытэтаў еўрапейскай гуманістыкі, "голад" на інфармацыю па гісторыі уніяцкай царквы абумовілі запатрабаванасць даследаванняў па уніяцкай праблематыцы. Ды і столькі новых ліній даследавання уніі адкрылі для гродзенскага гісторыка ранейшыя пошукі ў буйнейшых дакументах – і кнігасховішчах Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Апошнія гады даследчыцу асабліва цікавіць фінал царкоўнай уніі на Беларусі і постуніяцкая Беларусь: супраціў дэунізацыі 1780–1839 г., закуліссе Полацкага царкоўнага сабора 1839 г., міжнародны рэзананс на скасаванне уніі і іншыя тэмы, якія ўжо кладуцца ў радкі навуковых артыкулаў і будучых манаграфій. Таму штогод, як правіла, у час летняга адпачынку, Святлана Валянцінаўна працягвае свае архіўна-бібліятэчныя вандроўкі. А пакуль з'явіліся дзве новыя кнігі: "Беларуская гістарыяграфія Берасцейскай царкоўнай уніі" (Гродна: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт, 2002. 132 с.) і напісаная сумесна з гродзенскім філосафам прафесарам С.А.Габрусевічам праца "Прафесар Ігнат Анацэвіч. Жыццё. Спадчына" (Гродна: ГрДУ, 2005. 216 с.), якая расказала пра малавядомага гісторыка першай паловы XIX ст., першага беларускага даследчыка Вялікага княства Літоўскага і да таго ж – выхадца з уніяцкага асяроддзя.

Адно за другім ідуць Святлане Валянцінаўне асабістыя запрашэнні да ўдзелу ў прэстыжных навуковых канферэнцыях і навуковых выданнях, прапановы-просьбы аб рэцэнзаванні навуковых прац, дысертацый па канфесійнай гісторыі Беларусі, звароты за кансультацыямі з боку маладых даследчыкаў і не толькі беларускіх. Гэта прыйшло навуковае прызнанне. Сведчаннем яго з'яўляецца хоць бы запрашэнне С.В.Марозавай, як вучонага, аўтарытэтнага і ў Царкве, да ўдзелу ў міжнародным сімпозіуме "Універсітэт і Царква ў Еўропе", які летам 2003 г. сабраў у Рыме рэктараў і прафесуру еўрапейскіх універсітэтаў і якім аўдыенцыю даў Папа рымскі Ян Павел II. Хай не ўсім падабаецца трактоўка уніі, прапанаваная С.В.Марозавай, але факт прысутнасці даследчыцы ў навуковым жыцці відавочны. Невыпадкова Беларускае гістарычнае таварыства ў 2005 г. узнагародзіла яе дыпломам за плённую працу на ніве беларускай гістарычнай навукі.

Навуковы актыў гэтай вядомай гродзенскай даследчыцы, якая ўслед за прафесарам Я.Н. Марашам працягвае і развівае на кафедры гісторыі Беларусі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы традыцыі навуковай школы даследавання айчыннай

канфесійнай гісторыі, налічвае звыш 200 навуковых, навукова-папулярных і навукова-метадычных работ, шэраг з якіх надрукаваны за мяжой, размешчаны ў інтэрнэце; выступленні на больш чым 200 навуковых канферэнцыях рознага ўзроўню ў Беларусі і за мяжой, дзе прайшлі грунтоўную апрабацыю яе палажэнні і высновы; падрыхтаваны адзін кандыдат і 3 магістры гістарычных навук, больш за паўсотні абароненых дыпломных работ.

Цяпер С.В. Марозава сама ладзіць навуковыя канферэнцыі: абласныя, рэспубліканскія, міжнародныя ("Леў Сапега (1557–1633 г.) і яго час" (2007 г.), "Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа" (2008 г.), круглы стол, прысвечаны 170-годдзю Полацкага царкоўнага сабора (2009 г.), якія збіраюць у сценах Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы да сотні даследчыкаў і разам з выдадзенымі зборнікамі выклікаюць вялікую цікавасць вучоных, краязнаўцаў, духавенства.

Гісторыка-канфесійныя даследаванні С.В. Марозавай атрымліваюць працяг у распрацаваных ёй і выконваемых пад яе кіраўніцтвам навуковых праектах: «Изменение конфессиональной структуры населения Беларуси в конце XVIII – XIX веке» (падтрыманы ў 2003 г. Амерыканскім саветам навуковых таварыстваў), "Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа (канец X – пачатак XX ст.)" (выконваецца паводле дзяржаўнай праграмы комплексных навуковых даследаванняў "Эканоміка і грамадства» на 2006–2010 гады), "Беларуская мадэль канфесійнага развіцця (XVI – XX ст.)" (выконваецца па гранту Беларускага Рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў).

С.В. Марозава з'яўляецца сябрам Асацыяцыі беларускіх гісторыкаў, Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, Беларускага гістарычнага таварыства, рэдакцыйнай рады "Беларускага гістарычнага часопіса", рэдкалегіі "Весніка Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы".

Нельга не сказаць і пра педагагічную дзейнасць прафесара С.В.Марозавай. На факультэце гісторыі і сацыялогіі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта яна выкладае гісторыю Беларусі (са старажытнасці да сярэдзіны XVII ст.), крыніцазнаўства гісторыі Беларусі, спецкурсы "Берасцейская царкоўная унія 1596 г. у гісторыі Усходняй Еўропы (канец XVI–XIX ст.)", "Архівы Вялікага княства Літоўскага і іх лёс". Шмат гадоў працавала куратарам акадэмічнай групы.

Выкладчыца ўдзяляе вялікую ўвагу таленавітай студэнцкай і школьнай моладзі: заахвочвае студэнтаў да навукова-даследчай дзейнасці, прыцягвае іх да ўдзелу ў навуковых мерапрыемствах, рыхтуе студэнцкія работы на рэспубліканскія конкурсы навуковых і творчых работ. Кіравала студэнцкім навуковым гісторыка-краязнаўчым гуртком, які ў 2007 г. атрымаў прэмію Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў; годам раней прэмію і пасведчанне гэтага ж Фонду атрымала сама Святлана Валянцінаўна за асабісты ўклад у развіццё здольнасцяў таленавітай моладзі. Цяпер вядзе гурток "Рамяство гісторыка", у якім вучыць студэнтаў малодшых курсаў асновам навукова-гістарычнага даследавання.

І ў лекцыйным курсе, і ў пазааўдыторнай рабоце, што праводзіць прафесар С.В.Марозава, у тым ліку ў шматлікіх экскурсіях, якія яна штогод арганізуе для студэнтаў, і ў навуковай сферы яна прышчэплівае моладзі любоў да Беларусі і свайго краю, павагу да роднай мовы, айчыннай гісторыі і нацыянальнай культуры, разуменне ўласнага месца ў ланцугу пакаленняў, адказнасць за лёс сваёй краіны.

За сваю працавітасць і адказнасць, шчырасць і прыстойнасць С.В. Марозава карыстаецца павагай калег, два гады таму аднадушна яны зрабілі на яе карысць свой выбар загадчыка кафедры гісторыі Беларусі. Гэта вялікі давер і вялікая адказнасць, бо кафедра мае вялікі навуковы патэнцыял (95 % выкладчыкаў маюць вучоныя ступені і званні), навукова і грамадска актыўная, з высокім рэйтынгам ва універсітэце і ў рэспубліцы.

Прыняўшы адказнасць за справы такой значнай універсітэцкай структурнай адзінкі і такой вядомай і прызнанай у рэгіёне і краіне кафедры, прафесар С.В.Марозава актыўна ўключылася ў дзейнасць па яе прывядзенню ў адпаведнасць з прыярытэтнымі напрамкамі развіцця універсітэта, вышэйшай адукацыі, навукі (укараненне інавацыйных адукацыйных тэхналогій, інфарматызацыя вучэбнага працэсу, актуалізацыя тэматыкі і ўзмацненне практычнай значнасці навуковых даследаванняў і інш.), па ўзмацненю іміджа кафедры ў знешнім асяроддзі, па папулярызацыі гістарычных ведаў. Першымі крокамі на гэтым шляху сталі прэзентацыя кафедры, распрацоўка праекта "Гісторыкі Гродзеншчыны", напісанне гісторыі свайго факультэта, падрыхтоўка вучэбна-метадычных комплексаў, увага да ўкаранення навуковых прац выкладчыкаў.

Педагог і вучоны, які разумее, што ідэалогія, сістэма каштоўнасцяў, сацыяльныя паводзіны, палітычная культура грамадства складваюцца ў залежнасці ад таго, як людзі разумеюць і тлумачаць уласнае мінулае, С.В.Марозава на новым этапе сваёй прафесійнай дзейнасці поўная ідэй і натхнення, дый фізічных сіл для працы на карысць роднага факультэта і беларускай гістарычнай навукі.

**Заключэнне.** Такім чынам, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчыца кафедры гісторыі Беларусі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы Святлана Валянцінаўна Марозава з'яўляецца ўзорам высокага прафесіяналізму. Яна знаходзіцца ў ліку тых прадстаўнікоў айчыннай вышэйшай школы, якія пастаянна задаюць планку ў навуковым і адукацыйным асяроддзі.

### СПІС ЦЫТУЕМЫХ КРЫНІЦ

I. Асноўныя працы С.В.Марозавай:

1. Палуцкая, С.В. Пісьмовыя крыніцы па гісторыі Беларусі IX-XVIII ст.: Метадычныя парады па курсе «Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі» / Склад. С.В. Палуцкая – Гродна: Гродз. дзярж. ун-т імя Я. Купалы,1993. – 70 с.
2. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / І.П. Крэнь, І.І. Коўкель, С.В. Марозава, С.Я. Сяльверстава, І.А. Фёдараў. – Мінск: РІВШ БДУ, 2000. – Ч.1: Са старажытных часоў да канца XVIII ст.: курс лекцый – 656 с.
3. Марозава, С.В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады) / Пад навуковай рэдакцыяй У.М. Конана. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 352 с.
4. Марозава, С.В. Беларуская гістарыяграфія Берасцейскай царкоўнай уніі. – Гродна: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт, 2002. – 132 с.
5. Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі: Дапаможнік / У.Р. Казлякоў, С.В. Марозава, У.А. Сосна [і інш.] – Мінск: ТАА "ЦІПР", 2003. – 348 с.
6. Габрусевіч, С.А. Прафесар Ігнат Анацэвіч. Жыццё. Спадчына / С.А. Габрусевіч, С.В. Марозава – Гродна: ГрДУ, 2005. – 216 с.
7. Сосна, У.А. Гісторыя Беларусі XIX ст. – 1917 г.: вучэбны дапаможнік для 8-х класаў установ, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання / У.А. Сосна, С.В. Марозава, С.В. Паноў; пад рэд. М.С. Сташкевіча. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2005. – 168 с.
8. Морозова, С.В. Основы идеологии белорусского государства: учеб. пособ. / С.В. Морозова [и др.]. – Мн., 2004.

II. Літаратура пра С.В.Марозаву:

1. Марозава (Палуцкая) Святлана Валянцінаўна // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал.рэд.) [і інш.] – Мінск: Бел Эн, 1999. – Т. 5. – С. 79.
2. Спіс навуковых публікацый доктара гістарычных навук Святланы Марозавай (Палуцкай) // Гістарычны альманах. – 2004. – № 10. – С. 238–250.
3. Выхоўвайце ў сабе адказнасць ва ўсім // Университет и его педагоги. – Гродно: ГрГУ, 2006. – С. 200–207.
4. Морозова Светлана Валентиновна Историки Беларуси в начале XXI столетия: библиографический справочник / Г.В. Корзенко – Минск: Белорусская наука, 2007. – С. 262–263.
5. Марозава Святлана Валянцінаўна // Выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы: Бібліяграфічны даведнік / Пад. рэд. В.М. Чарапіцы. – Гродна: ГрДУ, 1999. – С. 323–324.
6. Марозава (Палуцкая) Святлана Валянцінаўна // Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя: у 2 т. – Мінск: БелЭн, 2006. – Т. 2. – С. 272.

*Материал поступил в редакцию 02.11.10*

**KORSCHAK M.A., STRELETS M.V. Svetlana Valentinovna Morozova: the portrait of a scientist and leacher**

In article for the first time in Belarusian philology an over-all analysis of the life and activity of the famous scientist, teacher, public figure of the country Svetlana Valentinovna Morozova has been given. The authors show her contribution to assimilation of a problem complex connected with the history of Uniate Church, the professor's participation in writing of educational supplies on the history of Belarus for institutions of higher education and schools of the Republic of Belarus. The quesion about Svetlana Valentinovna 's pedagogical skill being revealed both in a students' auditorium and outside it is dealt with. The authors have also turned to S.V. Morozova's work as the head of the department of the history of Belarus of the Yanka Kupala Grodno State University. By preparing the article S.V. Morozova's printed works and publications about her were used.

УДК 329.14(=924.5)(476-15)(091)

***Мощук А.В.***

# ПРОБЛЕМЫ ИСТОРИОГРАФИИ ПОЛЬСКОГО БУНДА

В отечественной и зарубежной историографии вопрос о деятельности польского Бунда на территории Западной Беларуси в 1921–1939 гг. не получил специального освещения. Вместе с тем отдельные аспекты данной темы затрагиваются в целом ряде работ, посвященных национальной и конфессиональной политике польского государства, истории рабочего движения, деятельности Коммунистической партии Западной Беларуси (КПЗБ) и Польской социалистической партии (ППС), истории культуры и просвещения Польши и Западной Беларуси в 20–30-е гг. XX в., а также в отдельных исследованиях по истории еврейского народа.

В советской историографии 1920–1930-х гг. основной упор делался на изучении деятельности Бунда до октября 1917 г. Начало изучению бундовского движения в Беларуси было положено в 20-е гг. XX в. выходом ряда работ мемуарного характера, посвящённых деятельности партии в конце XIX – начале XX вв.

В 1920-е гг. появились и первые научные работы по истории Бунда. Большой вклад в изучение деятельности Бунда внес один из его лидеров М. Рафес. Написанные им «Очерки по истории Бунда» до сих пор остаются единственным исследованием в советской и постсоветской историографии, в которой на основе большого количества фактического материала прослеживаются главные этапы становления и развития бундовского движения, его идеологии и тактики. Необходимо отметить, что автор в значительной степени преувеличивал и идеализировал роль Бунда в революционном движении, заявляя, что Бунд «на своих слабых плечах вынес большую часть борьбы за свержение... русского царизма». Некоторые аспекты деятельности Бунда на рубеже XIX–XX вв. были затронуты в работах Н.А. Бухбиндера «История еврейского рабочего движения в России», С. Х. Агурского «Очерки по истории революционного движения в Белоруссии 1863–1917 гг.» [3, 1]. Оба автора, характеризуя деятельность Бунда на территории Беларуси, преимущественно акцентировали своё внимание на борьбе большевиков против Бунда и Белорусской социалистической громады (БСГ).

На рубеже 20–30-х гг. XX в. в советской научной литературе появляются работы, тесно связывавшие Бунд с сионистским движением и представлявшие бундизм как «сионизм наизнанку». С этого момента и вплоть до начала 90-х гг. XX в. для советских, в том числе и белорусских историков, Бунд стал олицетворением оппортунизма, национализма и сепаратизма в российском и мировом социал-демократическом движении. Они критиковали «еврейский национализм Бунда», лозунг Бунда о «культурно-национальной автономии для евреев, который в условиях капитализма также служил сионизму».

Данные взгляды советских историков основывались на позиции В.И. Ленина по еврейскому вопросу. В основе этой позиции был решительный отказ рассматривать евреев как отдельную нацию, что аргументировалось тезисом об обязательности для нации общности территории и языка. Следует отметить, что после 1917 г. ленинские оценки Бунда и «еврейского вопроса» стали догмой вплоть до конца существования СССР.

Советская историография межвоенного периода, в том числе и белорусская, не акцентировали своё внимание на изучении истории польского Бунда на территории Западной Беларуси. Перед исторической наукой в данный момент стояли задачи комплексного анализа политического и экономического положения западнобелорусских земель в составе польского государства. При этом основной акцент делался на изучение революционного, рабочего и национально-освободительного движений на территории Западной Беларуси. Бунд, который являлся одним из основных конкурентов КПЗБ, подвергался резкой критике, а его деятельности давалась негативная оценка.

Первые шаги по изучению Западной Беларуси были сделаны в середине 1920-х гг. В 1926 г. при Инбелкульте была создана Комиссия по изучению Западной Беларуси. Результатом деятельности комиссии стали работы информационного характера, в которых были представлены сведения о различных моментах жизни Западной Беларуси. В них и в издаваемых Комиссией «Информационных бюллетенях» Бунд характеризовался как «оппортунистская, социал-фашистская партия, прислужница буржуазии» [4, 5].

Из опубликованных комиссией работ особое место занимает сборник «Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине» под редакцией С. Скульского [11]. В сборнике дана характеристика политических программ, структуры и основных направлений работы большинства политических партий, действовавших в Польше, Западной Беларуси и Западной Украине. Характеристика деятельности польского Бунда представлена в контексте теории социал-фашизма, вследствие чего оценки и выводы авторов носят тенденциозный характер. Кроме того, в сборнике активно, без каких-либо изменений, использовались материалы польской периодической и научной литературы межвоенного периода. Так, структура Бунда и его молодёжного крыла «Цукунфта», политическая программа партии полностью заимствованы из работ польского исследователя межвоенного периода А. Белциковской.

После вхождения Западной Беларуси в состав БССР интерес к политической и социально-экономической истории края усиливается. В период между 1939–1941 гг. в Москве и Минске основной акцент в исследованиях делался на информационно-просветительской работе. Основное внимание при этом уделялось вопросам истории западнобелорусских земель, уровню развития экономики, национальному и политическому положению населения края. Деятельность еврейских национальных партий, в том числе и Бунда, как правило, оставалась вне зоны внимания авторов.

В годы Великой Отечественной войны исследования по истории Западной Беларуси не проводились. Возрастание интереса к прошлому края произошло накануне 10-летия со дня вступления Западной Беларуси в состав БССР. В этот период активно тиражируются обширные сведения о положении рабочих Западной Беларуси в составе Польши, даётся характеристика политики польских и иностранных монополий, рассматривается революционное движение. Однако полностью отсутствует анализ политической ситуации в Западной Беларуси в 1920–1930-е гг., не показано участие политических партий в рабочем и революционном движениях.

Рубежом изучения истории Западной Беларуси стал 1956 г. На XX съезде КПСС роспуск III Коммунистическим Интернационалом (Коминтерном) в 1938 г. Коммунистической партии Польши (КПП), КПЗБ и Коммунистической партии Западной Украины (КПЗУ) был признан необоснованным. Сразу же после окончания съезда начинается подготовка и издание документальных материалов по истории КПЗБ

***Мощук Анатолий Васильевич,*** *кандидат исторических наук, доцент, заведующий кафедрой социально-политических и исторических наук Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*